УДК 94(476)

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ЭКАЛАГІЧНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР У КАНТЭКСЦЕ РАШЭННЯЎ XXXI З'ЕЗДА КПБ (1990 г.)

**Завацкі Я. І.**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
(Мінск, Рэспубліка Беларусь)
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук,
дацэнт Паддубская А. Ф.

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца рашэнні XXXI з'езда КПБ (1990 г.) па аптымізацыі дзяржаўнай палітыкі па ахове навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанні ў БССР. У дадзеным кантэксце аналізуюцца палажэнні дакументаў, якія прадугледжвалі якаснае вырашэнне экалагічных пытанняў: рэзалюцый, Канцэпцыі Праграмы КПБ, Пазіцыі і праграмы дзеянняў Кампартыі Беларусі ў сувязі з пераходам рэспублікі на рыначныя адносіны. У гэтых дакументах акцэнт рабіўся, галоўным чынам, на барацьбе з наступствамі чарнобыльскай катастрофы.

Ключавыя словы: з'езд, КПБ, перабудова, экалагічная палітыка, чарнобыльская катастрофа.

Summary. The article discusses the decisions of the XXXI congress of the CPB (1990) on the optimization of state policy on environmental protection and nature management in the BSSR. In this context, the provisions of the documents providing for the qualitative solution of environmental issues are analyzed: resolutions, the concept of the CPB program, the positions and action programs of the Communist Party of Belarus in connection with the transition of the republic to market relations. These documents focused mainly on the fight against the consequences of the Chernobyl disaster.

Keywords: congress, CPB, perestroika, environmental policy, Chernobyl disaster.

Рашэнні XXXI з'езда КПБ (28 лістапада – 1 снежня 1990 г.) у цэлым адпавядалі перабудовачнаму курсу, які ажыццяўляў саюзны цэнтр. Гэта тычылася публічнай падтрымкі дасягнення БССР эканамічнага суверэнітэту, пераходу Саветаў народных дэпутатаў усіх узроўняў да поўнаўладдзя на падначаленай ім тэрыторыі, усталявання ў рэспубліцы рэгуляванай рыначнай эканомікі і прававой дзяржавы [1, с. 2–3].

З'езд распачаў сваю працу з выступлення першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова, які распавёў дэлегатам аб тэндэнцыях у грамадска-палітычным і эканамічным жыцці рэспублікі з моманту правядзення XXX з'езда рэспубліканскай кампартыі. Яго справаздача закранала ў тым ліку і экалагічныя пытанні, у першую чаргу звязаныя з наступствамі чарнобыльскай катастрофы, якую Я. Сакалоў назваў «буйнейшай тэхніка-экалагічнай катастрофай XX стагоддзя» [1, с. 3].

Дзейнасць XXXI з'езда КПБ прыкметная тым, што ён па аналогіі з XXVIII з'ездам КПСС, які прайшоў летам 1990 г., усклаў віну за цяжкія наступствы чарнобыльскай аварыі на партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР і СССР. Так, Я. Сакалоў прызнаўся дэлегатам, што з самага пачатку бедства лідары Беларусі не здолелі прымусіць кіраўніцтва ЦК КПСС і ўрад краіны зняць палітыку сакрэтнасці і атрымаць поўны аб'ём інфармацыі аб наступствах катастрофы і давесці яе да шырокіх колаў грамадства.

У ажыццяўленні прыродаахоўнай палітыкі партыйная эліта Беларусі разглядала КПБ як авангард. Я. Сакалоў паведаміў дэлегатам, што ў пытаннях захавання экалагічнай чысціні беларуская кампартыя павінна будзе выступаць кансалідуючай сілай усіх грамадзян і грамадскіх аб'яднанняў. А ў тым, каб у рэспубліцы зладжана дзейнічалі прыродаахоўныя законы, клопат абавязана праявіць, перш за ўсё, партыйная група Вярхоўнага Савета БССР.

Выступоўца адзначыў, што было б слушна стварыць у самой кампартыі экалагічны рух. «Калі ты камуніст, а тым больш – кіраўнік, пачні з сябе, са свайго ўнутранага ачышчэння, аздараўлення свайго гонару і сумлення, з перагляду свайго стаўлення да экалогіі ў вялікім і малым», – сцвярджаў Я. Сакалоў [1, с. 3].

Далей першы сакратар ЦК КПБ падняў пытанне Рэспубліканскай комплекснай праграмы аховы навакольнага асяроддзя на 1991–1995 гг. і на перспектыву, якая прадугледжвала канкрэтныя захады па экалагічным выхаванні і адукацыі насельніцтва і якая засноўвалася на адпаведных галіновых і тэрытарыяльных праграмах. У сваім выступе Я. Сакалоў заклікаў усе партыйныя арганізацыі і камітэты рабіць вялікі ўнёсак у выкананне гэтых праграм.

Напрыканцы даклада першы сакратар ЦК КПБ заявіў дэлегатам, што беларуская кампартыя павысіць свой аўтарытэт у вачах мільёнаў суайчыннікаў, калі выступіць з публічнымі лозунгамі, накіраванымі на вырашэнне найбольш неадкладных грамадскіх праблем. Адзін з лозунгаў прагучаў з вуснаў Я. Сакалова такім чынам: «Экалогія ў шырокім сэнсе слова – ад экалогіі духоўнасці да экалогіі асяроддзя пражывання чалавека, і ў першую чаргу поўнае ачышчэнне ад усяго таго, што прынесла чарнобыльская бяда» [1, с. 3].

Рашэнні XXXI з'езда ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання знайшлі ўвасабленне ў шэрагу рэзалюцый, Канцэпцыі Праграмы КПБ, Пазіцыі і праграме дзеянняў Кампартыі Беларусі ў сувязі з пераходам рэспублікі на рыначныя адносіны.

У рэзалюцыі XXXI з'езда КПБ па справаздачы ЦК Кампартыі Беларусі і задачах партыйных арганізацый рэспублікі ў новых умовах адным са складальнікаў абавязку партыйных камітэтаў была аб'яўлена актывізацыя намаганняў па ажыццяўленні Дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі ў рэспубліцы наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС [2, с. 1].

У адпаведнасці з рэзалюцыяй «Аб сацыяльна-эканамічнай палітыцы КПБ ва ўмовах пераходу да рэгуляванага рынку» з'езд выступіў за структурнае рэфармаванне народнай гаспадаркі, прывязданне яе ў адпаведнасць з навукова-тэхнічным, працоўным і прыродна-рэсурсным патэнцыялам, развіццё эканамічных адносін, пры якіх ключавую ролю адыгрывалі б прадпрыемствы і працоўны калектыў [3, с. 2].

Рэзалюцыяй «Аб палітычнай ацэнцы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і ходзе прац па ліквідацыі яе наступстваў» з'езд усклаў персанальную адказнасць на Цэнтральны Камітэт, абкамы, гаркамы КПБ, пярвічныя партыйныя арганізацыі, камуністаў, якія працавалі ў Саветах народных дэпутатаў і гаспадарчых органах, за ажыццяўленне Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і выкананне ў 1990–1991 гадах заданняў па перасяленні насельніцтва з пацярпелых раёнаў згодна з зацверджанымі рашэннямі ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР [4, с. 2].

Рэзалюцыя «Аб палітыцы КПБ у галіне адукацыі, навукі і культуры» абвяшчала ў вышэйадзначаных сферах павышэнне экалагічнай пісьменнасці навучэнцаў і студэнтаў, засяроджванне асноўнай увагі ў навуковых даследаваннях на вывучэнні наступстваў чарнобыльскай аварыі, наданне новага імпульсу экалагічным даследаванням, «эстэтызацыі прадметнага асяроддзя» [5, с. 2].

Рэзалюцыя «Аб палітыцы КПБ у галіне аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту» абвяшчала неабходнасць зацвярджэння неадкладных агульнадзяржаўных захадаў для ўдасканалення ўсёй сістэмы аховы здароўя ў БССР. Да пераліку захадаў адносіліся правядзенне агульнадзяржаўных мерапрыемстваў па ахове навакольнага асяроддзя, а таксама стварэнне медыка-біялагічнага аддзялення АН БССР і эфектыўнага каардынуючага цэнтра, здольнага з выкарыстаннем комплекснага навуковага падыходу вырашыць усе медыцынскія праблемы, якія ўзніклі ў выніку чарнобыльскай катастрофы [6, с. 2].

Згодна з рэзалюцыяй «Аб маладзёжнай палітыцы Камуністычнай партыі Беларусі» рэспубліканская кампартыя абяцала падтрымку дзейнасці моладзі, у тым ліку ў пытаннях аховы прыроды [7, с. 3].

Прыродаахоўныя захады разглядаліся ў пятым раздзеле «За эфектыўную эканоміку» Канцэпцыі Праграмы КПБ. У першым падраздзеле «Аб эканамічнай самастойнасці рэспублікі» заяўлялася, што КПБ падтрымлівае права беларускага народа на прыродныя багацці, а таксама на вытворчую і сацыяльную інфраструктуру. Кампартыя рэспублікі падтрымлівала права рэспублікі самастойна прымаць рашэнні, якія рэгулявалі сацыяльна-эканамічныя адносіны, гаспадарчы механізм, арганізацыйную структуру кіравання, размяшчэнне прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый, устаноў вытворчай і сацыяльнай сферы. Беларуская кампартыя выказвалася за ўкараненне дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і правядзенне прыродаахоўных мерапрыемстваў.

У другім падраздзеле «Структурная перабудова народнай гаспадаркі» КПБ выступала за інтэнсіўнае развіццё навукова-



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

тэхнічнага прагрэсу, укараненне рэсурсазберагальнай, экалагічна бяспечнай і безадходнай вытворчасці.

Пяты падраздзел Канцэпцыі быў прысвечаны экалагічнай палітыцы. У вырашэнні прыродаахоўных праблем КПБ давала абяцанне на правядзенне комплексу мерапрыемстваў, у т. л. на абавязковае ажыццяўленне Дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі ў БССР наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, шырокае асвятленне ажыццяўляемай працы і радыяцыйнай сітуацыі ў месцах пражывання і дзейнасці насельніцтва. КПБ выказвала ўпэўненасць, што будзе супрацоўнічаць з усімі грамадскімі аб'яднаннямі, якія ажыццяўлялі ўнёсак у абарону і аздараўленне прыроды, у стварэнне экалагічна чыстай Беларусі [8, с. 2].

Згодна з Пазіцыяй і праграмай дзеянняў Кампартыі Беларусі ў сувязі з пераходам рэспублікі на рыначныя адносіны асновай далейшага сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця савецкага грамадства павінна было стаць павышэнне ролі навукі, тэхнікі, адукацыі і культуры. У сувязі з гэтым партыйнае кіраўніцтва рэспублікі лічыла неабходным у тым ліку стварыць спрыяльныя ўмовы для дзяржаўнай падтрымкі і заахвочвання распрацоўкі праблем рэсурсазберажэння і аховы прыроды [9, с. 1].

Вынікі дзейнасці XXXI з'езда КПБ засведчылі, што найбольш вострым пытаннем у ажыццяўленні дзяржаўнай экалагічнай палітыкі ў БССР з'яўлялася барацьба з наступствамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Для вырашэння гэтага пытання акцэнт рабіўся на актывізацыі Дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі ў рэспубліцы наступстваў тэхнагеннай катастрофы. Пры прыняцці рашэнняў у сферы аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання дэлегаты з'езда прытрымліваліся курсу саюзнага цэнтра, накіраванага на перабудову палітычнай і эканамічнай сістэм. Карэннаму рэфармаванню падлягала экалагічная палітыка і парадак ажыццяўлення яе суб'ектамі, што прадугледжвала перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне, укараненне ў іх дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, перадачу паўнамоцтваў на месцах Саветам народных дэпутатаў. Аднак разглядаемая палітыка рэалізоўвалася на практыцы з істотнымі цяжкасцямі, што часткова тлумачыцца інертнасцю мыслення кіруючых асоб і іх падначаленых, якія амаль усё сваё свядомае жыццё працавалі ва ўмовах каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. З іншага боку свой адбітак наклала дэцэнтралізацыя кіравання ў Савецкім Саюзе, што абярнулася пашырэннем паўнамоцтваў саюзных рэспублік. Гэта прывяло да разладу гаспадарчых адносін у краіне, якія склаліся ў папярэднія дзесяцігоддзі. Такім чынам, аб імгненным станоўчым эфекце радыкальнай перабудовы савецкай экалагічнай палітыкі не магло ісці размовы. Аднак дасягненню фінальнай кропкі ў якаснай перабудове адзначанай палітыкі перашкодзіў распад СССР, які адбыўся ў наступным 1991 г.

**Літаратура**


1. Отчет ЦК Компартии Белоруссии и задачи партийных организаций республики в новых условиях. Доклад Е.Е. Соколова на XXXI съезде КПБ 28 ноября 1990 года // Советская Белоруссия. – 1990. – 28 ноября. – С. 2–4.
2. Резолюция XXXI съезда Коммунистической партии Белоруссии по отчету ЦК Компартии Белоруссии и задачам партийных организаций республики в новых условиях // Советская Белоруссия. – 1990. – 7 декабря. – С. 1.
3. Резолюции XXXI съезда Коммунистической партии Белоруссии: О социально-экономической политике КПБ в условиях перехода к регулируемому рынку // Советская Белоруссия. – 1990. – 9 декабря. – С. 2.
4. Резолюции XXXI съезда Коммунистической партии Белоруссии: О политической оценке ситуации, сложившейся в республике после чернобыльской катастрофы, и хода работ по преодолению ее последствий // Советская Белоруссия. – 1990. – 9 декабря. – С. 2.
5. Резолюции XXXI съезда Коммунистической партии Белоруссии: О политике КПБ в области образования, науки и культуры // Советская Белоруссия. – 1990. – 9 декабря. – С. 2.
6. Резолюции XXXI съезда Коммунистической партии Белоруссии: О политике КПБ в области здравоохранения, физической культуры и спорта // Советская Белоруссия. – 1990. – 9 декабря. – С. 2.
7. Резолюции XXXI съезда Коммунистической партии Белоруссии: О молодежной политике Коммунистической партии Белоруссии // Советская Белоруссия. – 1990. – 9 декабря. – С. 3.
8. Концепция Программы Коммунистической партии Белоруссии // Советская Белоруссия. – 1990. – 7 декабря. – С. 2.
9. Позиция и программа действий Компартии Белоруссии в связи с переходом республики на рыночные отношения // Советская Белоруссия. – 1990. – 9 декабря. – С. 1.




Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова